# ЯЗЫК И ЛИТЕРАТУРА КАК ГЛАВНЫЕ ДУХОВНЫЕ ЦЕННОСТИ: СОЦИОКУЛЬТУРНЫЙ, ЛИНГВОКУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЙ, КОГНИТИВНЫЙ И ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЙ АСПЕКТЫ

## СЯМЕЙНЫЯ ПАРЫ БАГОЎ У ІРЛАНДСКАЙ, ГРЭЧАСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІЯХ: ПАРАЎНАЛЬНЫ АСПЕКТ

***Азарава В.В.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Гладкова Г.А.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Міф, светапогдял, міфалагічная сістэма, пантэон, мастацкі вобраз.
Keyworlds. Myth, worldview, mythological system, pantheon, artistic images.

Грэчаская, ірландская і беларуская міфалогіі былі дасканала разгледжаныя ў замежнай і беларускай літаратуразнаўчай навуцы (M. Aldhouse-Green “The Celtic Myths: A Guide to the Ancient Gods and Legends”; M. Williams “The Celtic Myths That Shape the Way We Think”; T. W. Rolleston “Celtic Myths and Legends”; А. М. Ненадавец “Міфалогія роднага краю” і інш.). Тым не менш, кампаратыўнае даследаванне міфалогій патрабуе новых ацэнак сучасных даследчыкаў. Мэта артыкула – на падставе міфалагічных сістэм Беларусі, Грэцыі, Ірландыі правесці кампаратыўны аналіз міфалогічных сістэм для выяўлення раней невядомых аспектаў.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі старажытныя грэчаскія, ірдандская і беларуская міфы. У працы выкарыстаны каампаратыўны метад даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як і ў кожнай міфалогіі, у грэчаскай, ірландскай і беларускай ёсць свае пантэоны багоў. Але ў ірландцаў і беларусаў амаль не прадстаўлены касмалагічныя міфы ці легенды. У ірландскай міфалогіі яны на захаваліся па прычыне таінства вучэння друідаў, якія лічылі, што людзям нельга ведаць пра паходжанне зямлі. У беларусаў такіх міфаў няма (па агульнапрынятай думцы) з-за адсутнасці пісьменнасці ў дахрысціянскія часы.

Галоўнымі багамі ў ірландскай і беларускай міфалогіях былі Луг і Пярун суадносна (як сімвалы жыцця і святу). Сынам бога Луга быў Кухулін.

Па некаторых звестках дзеці Перуна – гэта Дажбог і Дзявана альбо Кастрома і Купала. У ірландцаў ёсць асобны Бог, які адказвае за маланкі, - гэта Тараніс, са старажытна-ірландскай – "Грамавержац".

У багоў ёсць жонкі. У Луга – гэта Дэйхтрэ, дзева з племені Сыноў Міля. У Пяруна – Мокаш, Дадона ці ўвогуле Пярыня, гледзячы ад якой крыніцы адштурхоўваецца.

Жаніцьба, па адной з крыніц, у Пяруна і Пярыні адбылася пасля таго, як бог выратаваў багіню ад Вялеса, які закахаўся ў яе; па другой версіі – ад Скіпера-жывёлы. Па другой версіі Пярыня даводзіцца яму не толькі жонкай, але і сястрой.

Дэйхтрэ, як і пярунава жонка, увасабляе сабой маці-зямлю. Шлюб Дэйхтрэ (ці жонкі Пяруна) з галоўным богам пантэона адлюстроўвае саюз зямлі з сонцам, чалавечае жыццё. Так, калі верыць легендам, аднойчы Дэйхтрэ прапала разам са сваімі сяброўкамі і тры гады пра іх ніхто не чуў, пакуль птушкі не прывялі караля Фергуса і яго воінаў да палаца Луга. Калі воіны хацелі забраць з сабой Дэйхтрэ, яна адказала, што хворая і папрасіла пачакаць ноч. Раніцай воіны ўбачылі немаўля, якое назвалі Кухулінам.

У скандынаваў таксама прысутнічае сямейная пара багоў – Фрыг альбо Фрыга і Одзін. Фрыг – апякунка кахання, шлюбу, хатняга агню, дзіцянараджэння. У адной з легенд багіня падманвае свайго мужа. Падчас вайны вінілераў і вандалаў Одзіна прасілі аб дапамозе вандалы, а вінілеры – Фрыг. І каб дапамагчы вінілерам, Фрыг павярнула ложак так, што першымі Одзін убачыў вінілераў і вымушыаны дапамагчы быў ім у перамозе над ворагамі. Акрамя таго, Фрыг даравала мужу магчымасць бачыць будучыню.

У старажытных грэкаў сям'ю сярод багоў увасаблялі Гера і Зеўс. Нягледзячы на гэта, у Зеўса было шмат дзяцей па-за шлюбам. З-за здрады мужа Гера імкнулася пакараць дзяцей, якія нараджаліся ад сувязей Зеўса і іншых жанчын. Геры, як жанчыне, па статусе прыходзілася мірыцца з характарам мужа.

Юнона і Авось увасабляюць сабой сям'ю як з пункту гледжання мужа і жонкі, так і з пункту гледжання сястры і брата. Па легендзе Юнону спакусіў яе родны брат Юпітэр, каторы паратварыўся ў зязюлю. Дакладна невядома, ці былі Пярун і яго жонка братам і сястрой альбо проста мужам і жонкай.

Вядомыя святы прысвечаныя багам. Так званы "Пярунаў дзень" быў чацвер, а датай нараджэння бога лічылася 20 ліпеня. У гэты дзень забівалі быка ці дзіка ў ахвяру богу. Невядома калі, але свята ў гонар жонкі Перуна таксама мела месца быць.

Свята галоўных багоў замежных міфалогій магло адзначацца спаборніцтвамі (напрыклад, Зеўса і Геры). Было толькі адно адрозненне: жанчынам дазвалялася ўдзельнічаць у спаборніцтвах, але дыстанцыя былі менш, чым у мужчын ды і некаторыя віды спорту яны не маглі сабе дазволіць. Нельга не адзначыць старажытнае свята, прысвечанае Юноне. Яно святкавалася 1 сакавіка як дзень замужніх жанчын, так званыя матраналіі. У гэты дзень жанчыны неслі вянкі ў храм Юноны і адтрымлівалі падарункі ад дочак і мужоў. Свята можна лічыць папярэднікам 8 красавіка.

Акрамя таго, традыцыі святкаваць дні ў гонар паганскіх багоў засталіся і сёння. У беларусаў ёсць рытуальна-абрадавы комплекс "ваджэнне і пахаванне стралы". Жанчыны ішлі на ўсю шырыню вуліцы ў вёсцы, паклаўшы рукі адзін аднаму на плечы. Адтрымлівалася нібы вяроўка, ці тая самая страла. І прысвечана дзеянне было Пяруну.

У Ірландыі існуе сваё свята, прысведчанае заканчэнню збору ўраджая. Называецца Самайн, хоць і больш вядомы пад сучаснай назвай – Хэлуін. Самайн ірландцы часам называлі "святам памерлых". Пачыналася свята ў ноч з 31 кастрычніка на 1 лістапада. Сёння ў гэтую дату людзі Заходняй Еўропы святкуюць Хэлуін, які таксама называецца "святам памерлых".

Нельга не адзначыць Бэлтэйн – свята, звязанае з пачаткам лета, якое святкуецца 1 мая. У беларускай (хрысціянскай) традыцыі ёсць Юр'еў дзень, аднак нельга сказаць, што да прыняцця хрысціянства не было свайго свята лета. Хутчэй за ўсё дакладна невядома, як і ў які дзень яно праводзілася, звесткі пра ахвярапрынашэнне Перуну ці Вялесу захаваліся толькі ў літаратурных помніках.

У беларускіх і ірландскіх летапісах (у Ірландыі іх называюць скеламі), сярэднявечых манускрыптах і сагах нярэдка адзначаюцца багі. Распавядаецца пра іх добрыя якасці, знешнасць, дзеянні. Як правіла, імёнамі багоў замацоўвалі клятву князі: князь Ігар быў прыведзены да прысягі грэчаскімі пасламі, князь Святаслаў Ігаравіч кляўся Перуном ў дамове 971 года (пераклад А. В. Творагава): "Если же не соблюдаем мы чего-либо из сказанного раньше, пусть я и те, кто со мною и подо мною, будем прокляты от бога, в которого веруем,–в Перуна и в Волоса, бога скота, и да будем колоты, как золото (или да будем желты как золото), и своим оружием будем посечены и умрем». Больш за тое, каралі і князі імкнуліся весці карані сваёй радаслоўнай ад галоўных багоў, каб адзначыць сваё боскае права на пасад і ўладу. У ірландцаў было прынята весці свой род ад Кухуліна, сына Луга, які лічыўся слаўным воінам і быў вядомы сваёй адвагаю і баявой лютасцю.

Як адзначае Г.А. Гладкова, міфалогія старажытных культур застаецца крыніцай сюжэтаў і ў сучаснай літаратуры [1, с. 8]. Безумоўна, стасункі багоў дэманструюць усе разнавіднасці грамадскіх узаемаадносін, мадэль сям'і, узаемаадносіны мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей, там з поўным правам можна лічыць міфы скарбонкай культурнай памяці чалавецтва.

**Заключэнне**. Такім вобразам, пантэон ірландскай, грэчаскай і беларускай міфалогій ахоплівае ўсю раннюю культуру краін з наступным яе развіццем і адлюстраваннем міфаў у літаратуры, жывапісе і іншых відах мастацтва. Кампаратыўны аналіз дазваляе казаць пра блізкасць канцэпцый міфалогій, якія раскрываюцца праз мадэль пантэона багоў, увасабляюць мінталітэт людзей і нацыянальную самасвядомасць. Няпростыя сямейныя стасункі багоў адлюстроўваюць увесь спектр адносін паміж мужчынай і жанчынай у дахрысціянскія часы.

1. Гладкова, Г.А. Айчынная і сусветная літаратура: вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў неспец. фак. дзённай і завочнай форм навучання / Г. А. Гладкова; М-ва адукацыі РБ, УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", Каф. беларус. літ. – Віцебск: УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", 2008. – 88 с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/2669 (дата доступа: 08.09.2023).

## РУССКОЯЗЫЧНЫЕ ПРЕДИКАТЫ ЭСТЕТИЧЕСКОЙ ОЦЕНКИ КАК ИНСТРУМЕНТ ВЫРАЖЕНИЯ НЕОДОБРЕНИЯ

***Азарченко Г.Ю.,***
*аспирант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель –* ***Никитенко Т.В.,*** *канд. филол. наук, доцент*

Ключевые слова. Неодобрение, оценка, эстетическая оценка, сублимированная оценка, предикат, лексема.

Keywords. Disapproval, evaluation, esthetic evaluation, sublimated evaluation, predicate, lexeme.

Данное исследование выполнено в рамках лингвистической аксиологии и посвящено вопросу экспликации эстетической оценки в лексическом фонде русского языка. Целью работы является выявление особенностей эстетических предикатов, выражающих неодобрение в русском языке.

**Материал и методы.** В ходе исследования мы, опираясь на опыт Н.Д. Арутюновой, Е.М. Вольф, Ю.Д. Апресяна, М.А. Тихоновой, Т.В. Никитенко и др. в данной области, проанализировали лексемы, зафиксированные в «Большом толковом словаре русского языка» С.А. Кузнецова (2000 г.). Кроме того, в работе в качестве иллюстрации выявленных особенностей предикатов использованы данные Национального корпуса русского языка, https://ruscorpora.ru/. В статье использованы метод словарных дефиниций и описательно-аналитический метод.

**Результаты и их обсуждение.** Несмотря на то, что оценка признаётся одной из основополагающих категорий действительности и важнейших сторон интеллектуальной деятельности человека, многие исследователи сталкиваются с проблемой множественности дефиниций данного явления [5, с. 163]. Мы в данной работе придерживаемся следующего понимания оценки: «Оценка – категория, обозначающая аксиологическое отношение человека ко всему нормативно представленному многообразию предметных воплощений человеческой жизнедеятельности и возможностям их познавательного и практического освоения» [4, с. 631].

Положительная оценка, как правило, воплощается в одобрении, похвале, восхищении, восторге, ласке и др., отрицательная – в неодобрении, порицании, осуждении, досаде, раздражении и др. Так, для достижения цели нашего исследования необходимо проанализировать специфику понятия «неодобрение».

Неодобрение – это указание на то, что говорящий признает что-то плохим, относится к кому-либо/чему-либо с осуждением, отрицательно оценивает, подвергает критике, порицает кого-либо [6, с. 37]. Общее значение неодобрения подразделяется на частные: упрекать, порицать, осуждать, обвинять и т.д.

При неодобрении особое значение имеет норма: это упущенная возможность, нереализованная положительная ситуация. Она всегда подразумевается говорящим и нередко вербализуется либо вместе с отрицательной ситуацией, либо самостоятельно.